**Канспект прагулкі-паходу**
**“Вяселы паход на луг ”**

**Мэта:** пазнаёміць дзяцей з прыродным згуртаваннем луг.

На лузе выхавальнік задае пытанне:

- Як вы думаеце, хто жыве на лузе?
- Так, павільна, на лузе жывуць - насякомыя

**Дыдактычная гульня “Адгадай хто гэта?”** (Выхавальнік паказвае дзецям карцінкі з насякомымі.)

Дзеці, мы з вамі ведаем, што на лузе шмат розных насякомых. Паглядзіце, якія прыгожыя лётаюць матылькі, стракозы, прыгаюць конікі. Але памятайце, што ў траве могуць схавацца і небяспечныя кляшчы, па-гэтаму пасля прагулкі патрэбна абязкова агледзець сябе і сяброў на прадмет наяўнасці кляшчоў.

**Гульня «Насякомыя»**

Шмель жужыць (дзеці прыціскаюць рукі да тулава, хутка машуць рукамі)

Пішчыць камар (выстаўляюць указальны палец, астатнія сціскаюць у кулак)

Лётае матылёк (павольна машуць рукамі)

Пчолы назапашваюць мёд (указальны палец правай рукі засоўваюць у кулак левай)

А зараз я загадаю вам **загадкі:**

І жучок я, і кароўка,
У чорных вусіках галоўка.
Я прыгажэйшая за многіх мошак.
Крылы чырвоныя, у гарошак. (*Божая кароўка*)

Доўгі насок, тонкі галасок,
хто яго заб'е, той сваю кроў пралье. *(Камар.)*

Паглядзі: вось гэта конь —
Ярка-рыжы, як агонь.
Лезе угору ён без стомы,
Цягне бервяно для дома. *(Мурашка)*

Не пытайся ў мамы —
Сам гавары:
Хто бегае над намі
Нагамі
Дагары? *(Муха)*

Не сякера, а шуміць,

не пілот, а ляціць,
не змяя, а жаліць. (*Пчала*)

Без станка, без рук,
а кросны тчэ. (*Павук*)

Выхавальнік падрыхтаваў для дзяцей сюрпрызны момант: цацка мядзведзя.

- Дзеці паглядзіце хто прыйшоў да нас? (Адказы дзяцей)
- Правільна, гэта мядзведзь – ён любіць есці мед, таксама слухаць як спяваюць птушкі, а яшчэ хоча з вамі пагуляць.

**Рухомая гульня «Мішка буры»**

Буры мішка, мішка буры,
Чаго ты такі сумны? (Дзеці ідуць да «мядзведзя»).
Мядзведзь:
Я булачкай не пачаставаўся,
Ад таго і раззлаваўся.
Раз, два, тры, чатыры, пяць
Пачынаю даганяць. (Даганяе дзяцей).
Мядзведзь:

- Дзякуй вам мае маленькія сябры. Мне вельмі падабаецца прыходзіць на лужок. Гуляць з вамі весела, але ж мне трэба вяртацца ў лес. Да сустрэчы! (Дзеці развітваюцца з мядзведзем).

**Рухомая гульня “Гусі-лебедзі”.**